№ 168 (290)
Серада, 24 верасня 1997 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец — ТАА "Народная воля"
Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

Сонца

	Усход	Заход
Віцебск	6.47	18.56
Магілёў	6.47	18.55
Гомель	6.44	18.52
Мінск	6.57	19.05
Гродна	7.13	19.21
Брэст	7.13	19.21

Маладзік 1 кастрычніка.

59 дней в неволе



Мы ждем тебя, Павел!

Демократия по-белорусски

Крепостные прокуроры и судьи

О введении в Беларуси уникального для конца двадцатого века крепостного права редакции сообщил пресс-центр Объединенной гражданской партии. Сама партия почерпнула потрясающую новость из декрета главы государства №16 о служащих госаппарата. Очередной шедевр гласит, что отныне порядок присвоения классных чинов и надбавок служителям права будет определять президент. На практике, которая в республике несравненно суровее закона, карьера и зарплата каждого прокурора и судьи будет зависеть от единственного владельца крепостных душ.

20 лет в поте лица должен трудиться на хозяина батрак с лычками на мундире и в судейской мантии, прежде чем ему, как псу верному, дадут "служебное жилое помещение". Десять лет срока надо отбыть на барщине уже после вступления в силу средневекового по смыслу декрета от 11 сентября 1997 года. Квартиры, в которых уже живут прокурорские работники и судьи, переводятся в ранг служебных. Не потрафил главному феодалу республики — изволь, юридическая душонка, идти по миру с сумой вместе с домочадцами. Чины, которые успели приватизировать жилье, еще надеются, что их беда минует. Зря уповают, потому что их право частной собственности на квартиры президент в мгновенье ока может отменить.

Напрасны надежды всех пособников усиливающегося авторитаризма на то, что их лично произвол не коснется. Он достанет всю "вертикаль", весь госаппарат, все подневольные средства массовой информации. В конце концов, есть в том своя сермяжная справедливость: кто по-холуйски близок блажному пану, тому и тумаков больше. Исторический опыт свидетельствует, что при феодализме самая горькая участь постигает именно дворовую крепостную челядь.

Людмила ВАЛЕНТИНОВА.

Леонилия ПЯРМИНЕНЕ:

"Теоретически – лошадь, практически – не пашет,

или Какие социальные гарантии у свободных журналистов"

Людмила МАСЛЮКОВА,
политический обозреватель "Народной воли"

В конце минувшей недели, укрывшись в лесу в щитовых домиках "Риту кемпингас" между Вильнюсом и пограничным постом "Каменный лог", представители пишущей братии из трех стран провели Международную конференцию.

Не следует путать с "лесными братьями"!.. Все прибыли на сходку совершенно легально — по визам принимающей страны и по официальному приглашению старейшего в Европе германского фонда имени Фридриха Эберта. Данное конкретное предложение провести дискуссию по проблемам законодательства о печати в трех различных государствах исходила из уст сотрудника фонда господина Лапиня, курирующего восточный постсоветский регион.

Конечно, с точки зрения компетентных органов Республики Беларусь, место вполне подозрительное, поскольку напрямую связано с телесюжетом, который минувшим летом отснял на этом Ошмянском участке белорусско-литовской границы российский журналист Павел Шеремет, который сидит в тюрьме почти два месяца, и никакие силы международного права не в состоянии распахнуть перед ним двери темницы.

Один этот факт вполне доходчиво характеризовал те этические, правовые и социальные условия, в которых сегодня живет и действует белорусская журналистика. На вильнюсском семинаре она была представлена разнообразными изданиями: публицист Леонид Лохманенко из национальной ежедневной газеты "Звязда", Вячеслав Ходасовский — главный редактор еженедельника "Белорусский рынок", Иосиф Середич — главный редактор ежедневной общественно-политической газеты "Народная воля", печатающейся, как известно, не у себя дома, в Беларуси, а в столице Литвы, и так далее.

Галина Курбанова из русскоязычного издания "Эхо Литвы", одна из сотрудниц "толстого" еженедельного "Литовского курьера", председатель Союза журналистов Литвы Римгаудас Эйлунавичюс и прочие их коллеги, покинувшие на время свои вильнюсские кабинеты и офисы, также расположились в кемпинге на 18—20 сентября ради обмена мнениями с немцами и белорусами.

Трехсторонняя дискуссия конкретизировала и всесторонне аргументировала далеко не новую истину: законодательные основы работы журналистов в Литве, Беларуси и Германии очень разные.

Принятый в Литве в июле 1996 года закон о печати послужил основой ликвидации государственного управления печатью, развития частных мощных изданий типа закрытого акционерного общества "Летувос ритас", возникновения шести каналов национального телевидения и иных не менее знаменательных явлений. Очевидный прорыв, по мнению юриста Римаса Шукиса из Института журналистики, не снял с повестки дня проблему защиты свободы слова от посягательств на нее властных структур.

К примеру, путем интриг втайне от широкой публики кто-то пытается протащить в действующий закон о печати поправку, которая даст право правительству назначать, как чиновника, инспектора по этике, хотя до сих пор это должностное лицо несло ответственность перед журналистской и читательской общественностью. Наряду с подобными рецидивами прошлого литовская пресса уже познала и горький вкус давления на совесть журналистов крупного капитала, издателей и владельцев средств массовой информации.

Экс-судья Конституционного суда Беларуси Михаил Пастухов сделал доклад об основных положениях принятого в январе 1995 года белорусского закона о печати. Он подробно проанализировал, как с помощью президентских декретов и указов, решений правительства, а главное, при циничном применении грубой силы исполнительная власть республики, по сути, уже сейчас от свободы печати оставила рожки да ножки.

Заведующий отделом ведомства по прессе и информации федерального правительства Германии Герд Флауме рассказал о принципах, на которых базируются законы о печати 16 немецких земель. В западной части страны они действуют давно, а в последние годы приняты и ландтагами на территории бывшей ГДР. Это был, как подчеркнул сам Флауме, доклад о "другой звезде", поскольку германский мир печати от белорусского отделяет космическое расстояние.

Немецких журналистов и общественность сегодня, например, волнует то, что на практике далеко не всегда соблюдается такая норма права: даже перед судом репортер или аналитик не обязан называть источники информации, полученной конфиденциально. Зачастую органы прокуратуры Германии, применяя юридические уловки, норовят раскрыть тайну редакции, что, по убеждению немцев, уже есть ущемление свободы слова.

С другой стороны, много любопытного поведала о жизненных коллизиях в прошлом журналист, а ныне опытный профсоюзный практик Инес Кюн из земли Нижняя Саксония. В сорокатысячном журналистском профсоюзе Германии объединены примерно 70 процентов работающих в газетах и еженедельниках, на радио и телевидении. Дважды наши немецкие коллеги проводили забастовки в защиту своих профессиональных прав и свобод. Кто же угрожал им в развитой цивилизованной державе? Работодатели, издатели, собственники, держатели контрольных пакетов акций редакций. Конфликт между творчеством и деньгами в Германии носит застарелый и довольно острый характер, и конца ему не видно, он из разряда вечных.

Из всего прозвучавшего на конференции вытекало, что свобода слова, социальные гарантии тружеников пера и микрофона, полнота и объективность потребляемой населением информации в общем и целом проблематичны и в Литве, и в Беларуси, и в Германии. Глубина противоречий, несомненно, очень разная. Но для каждой из трех стран вполне применим заголовок одной из публикаций литовского журналиста доктора социальных наук Леонилии Пярминене: "Теоретически — лошадь, практически — не пашет, или Какие социальные гарантии у свободных журналистов". Эта статья вышла в газете "Журналистские ведомости" накануне международной конференции в двадцати пяти километрах от Вильнюса. На опыте Литвы автор убедительно доказала, что с социальными гарантиями пока далеко не все благополучно и у наших ближайших соседей.

Представители Литвы и Беларуси вместе заявили немецким представителям: "Нам бы ваши проблемы!" Учитывая особенно тяжелое положение со свободой печати, складывающееся в Беларуси, все три стороны приняли обращение к ОБСЕ и международным журналистским организациям. Его полный текст предлагается вниманию читателей "Народной воли".

Обращение

Международной конференции "Профессиональная этика журналистов и законодательные основы деятельности СМИ в Литве, Беларуси и Германии"

город Вильнюс, 20 сентября 1997 года

Не допустить уничтожения свободы слова в Беларуси

Участники международной конференции с особой озабоченностью констатируют, что в результате эскалации со стороны официальных властей Беларуси противоправных действий в отношении журналистов, прежде всего негосударственных СМИ, в стране сложилась реальная угроза существованию института свободной прессы.

В результате государственной монополии на электронные и печатные средства массовой информации граждане Беларуси фактически лишены права на получение объективной информации.

Немногочисленные негосударственные издания вынуждены действовать в условиях правовой, экономической и информационной дискриминации.

Независимые журналисты подвергаются необоснованным судебным преследованиям, шантажу со стороны представителей власти, нередко избиваются во время исполнения своего профессионального долга.

Последним рубежом, за которым последует ликвидация негосударственных демократических СМИ, могут стать подготовленные властями поправки в Закон Республики Беларусь "О печати и других средствах массовой информации". Согласно этим поправкам, все средства массовой информации попадают под жесткий тотальный контроль органов исполнительной власти. Фактически вводится цензура над деятельностью СМИ. Предполагается установить контроль за всей издательской деятельностью, вплоть до выпуска единичных экземпляров.

Участники международной конференции журналистов заявляют, что подготовленные поправки в закон о печати противоречат основополагающим актам международного права, в том числе: Всеобщей декларации прав человека, Международному пакту о гражданских и политических правах, Европейской конвенции о защите прав и основных свобод, Заключительному акту Совещания по безопасности и сотрудничеству в Европе.

Мы призываем ОБСЕ и международные журналистские организации обратить внимание на реальную угрозу уничтожения в Беларуси свободы слова и потребовать от президента и правительства Беларуси обеспечить соблюдение права ее граждан на получение и распространение информации.

Дні Тайбэя ў Мінску

У мінулыя выхадныя завяршылася дзелавая частка праводзімых у Мінску дзён Тайбэя. Дэлегацыя тайваньскага горада, якая прыбыла на гэта мерапрыемства, азнаёміла прадстаўнікоў нашых дзелавых, фінансавых колаў, навуковую і творчую інтэлігенцыю з дасягненнямі гэтай краіны ў адпаведных галінах эканомікі.

На семінары "Сучасны Тайвань", праведзеным у Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры, выступілі не толькі госці з Азіяцкага рэгіёну, але і спецыялісты з Мінска і Масквы.

У рамках Дзён была арганізавана выстаўка ўзораў прадукцыі прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу Тайваня, якія маюць свае прадстаўніцтвы ў краінах СНД. Акрамя таго, адбыліся гутаркі за "круглым сталом" з удзелам бізнесменаў беларускай сталіцы і Тайбэя. На ім размова ішла ў асноўным аб перспектывах супрацоўніцтва. Бакі дамовіліся стварыць у Мінску "Цэнтр дзелавых сувязей ТайМін", які будзе садзейнічаць пошуку дзелавых партнёраў.

Галіна ШАРАЕВА, БелТА.

Незалежная экспертыза

Уладзімір КУЛАЖАНКА, доктар эканамічных навук, прафесар

Кажуць, што цэны не будуць павышацца, а яны скачуць, як шалёныя...

На рынку спажывецкіх тавараў і камунальных паслуг у верасні пачаўся чарговы асенні марафон павышэння цэн. Ён ідзе па раней вызначанаму сцэнарыю. Спачатку кіраўнікі высокага рангу, супакойваючы людзей, аб'яўляюць, што рэзкага павышэння цэн не будзе. Заўважым — *толькі рэзкага*. Або аб'яўляецца, што прадукты харчавання ў нас танныя, вывозяцца ў суседнія раёны Расіі. Услед за гэтым адбываецца абавязковае павышэнне цэн.

Так сталася і зараз. Пасля таго як на пачатку верасня пасля нарады ў Савеце міністраў Аляксандр Лукашэнка заявіў, што абвальнага павышэння цэн не будзе, ужо праз некалькі дзён былі павышаны цэны на хлеб і мяса. Пры гэтым тактыка павышэння — надзвычай асцярожная. Хлебазаводам дазволена ў верасні павысіць рознічныя цэны на хлеб аж на 10% (заўважым, у чарговы раз), а на булачныя вырабы — на 5%. Але пастаўлена ўмова, што цэны будуць павышацца паступова: на 2—3% за кожныя наступныя 10 дзён. Каб не напужаліся спажыўцы. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы патлумачыў свайму электарату гэтую меру тым, што мноства спекулянтаў, пэўна "чаўнакоў", вывозіць хлеб у Расію для продажу, дзе ён нібы аж у 3—4 разы даражэйшы.

Чарговае павышэнне цэн на хлеб у верасні праводзіцца ва ўмовах, калі ў параўнанні з чэрвенем цэны на хлеб масавых гатункаў ужо павысіліся на 20%, а на батоны масавых гатункаў — на 15. І яшчэ ёсць адзін момант, які выклікае здзіўленне. Улады не адзін раз хваліліся, што сёлета будзе намалочана на 1 млн. тон збожжа болей. І раптам павышэнне цэн на хлеб. Як гэта разумець?

Знайшліся прычыны і для павышэння цэн на ялавічыну ды іншыя віды мясапрадуктаў. Тлумачыцца ўсё павышэннем у жніўні закупачных цэн на 15% на буйную рагатую жывёлу, стратнасць вытворчасці цыплят-бройлераў і напружанасць з рэсурсамі мяса ў краіне. Цэны на мясапрадукты ўжо павысіліся ў параўнанні з чэрвенем на 17—30%, а на субпрадукты — дык аж на 33—37%. Новыя цэннікі ў магазінах проста палохаюць пакупнікоў сваімі лічбамі. Нават вараная каўбаса пераваліла ў цане 100 тыс. руб. за кілаграм. А якасныя прадукты — далёка за 200 тыс. руб. Але гэтага, відаць, мала. Цэны ў канцы верасня на мясапрадукты, бадай, зноў падымуцца, і па таму ж, як і на хлеб, сцэнарыю — на 2—3% за кожныя 10 дзён. Нядрэнна прыдумана, каб людзі паступова прывыкалі і не абураліся.

Ёсць падставы прынятую практыку павышэння спажывецкіх цэн назваць эскалацыяй. Але ў дадатак да гэтага павышэнне цэн прымае яшчэ і комплексны характар. Нядаўна павышаны, і, па ўсяму бачна, не ў апошні раз, цэны на спіртное. Канешне, гарэлка — гэта не хлеб. Можна і трэба абмежаваць яе спажыванне і праз павышэнне цэн. Але такога ўзлёту цэн на гарэлку, калі паўлітровая пляшка 40-градуснай павысілася прыкладна з 40 тысяч рублёў да 57—60 тысяч, яшчэ не было. Раней не без падстаў гаварылі, што хоць гарэлка ў нас танная (пры дарагой закусцы). Зараз і гэтага ўжо не скажаш.

Па заданаму сцэнарыю павышаюцца цэны і на жыллёва-камунальныя паслугі. Спачатку выдаецца своеасаблівы папулісцкі запеў у выглядзе "Заявы Савета міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь", дзе абвяшчаецца гранічны каэфіцыент павышэння тарыфаў на камунальныя паслугі — 1,2, значыць, на 20% — да канца года. Маўляў, хваліце, спажыўцы, урад, які не дазваляе павысіць кошт жылля болей як на 20%. Але вельмі сумніцельна, каб было адабрэнне, бо пры мізэрнай заработнай плаце за стандартныя невялікія аднапакаёвыя, двухпакаёвыя і трохпакаёвыя кватэры трэба будзе плаціць адпаведна 280, 400 і 550 тыс. руб. у месяц.

Пасля азначанага і маючага адбыцца павышэння цэн на прадукты харчавання і камунальныя паслугі, а таксама на гарэлку, няцяжка ўбачыць, чым закончыцца гульня ў падтрыманне інфляцыі на ўзроўні 2% у месяц да канца года. Выклікае здзіўленне, як звядзе канцы з канцамі галоўны куратар эканомікі краіны Пётр Пракаповіч, як ён выканае загад прэзідэнта не дапусціць павышэння інфляцыі вышэй 2% у месяц пры такім росце платы за камунальныя паслугі, цэн на прадукты харчавання, у тым ліку хлеб? Нават простыя людзі ведаюць, што ўслед за ростам цэн на хлеб, які, па народнаму вызначэнню, усяму галава, непазбежна павышаюцца цэны на ўсе іншыя прадукты харчавання. На чарзе — павышэнне цэн на малако і малакапрадукты.

Заўважым, што павышэнне мінімальнай заработнай платы, якую яшчэ, праўда, ніхто не атрымліваў, таксама будзе дзейнічаць у кірунку сілкавання інфляцыі. А пры інфляцыі ўсім вядома, куды пойдзе павышаная заработная плата.

Дерзайте!

Есть шанс стать современным бизнесменом

Новая программа Информационного агентства Соединенных Штатов(USIA) Community Connections предусматривает стажировку белорусских специалистов в США в течение 3—5 недель в 1997—1998 годах. Программа ставит своей целью ознакомление с американским бизнесом, деятельностью правительственных и негосударственных организаций, создание деловых и культурных связей между региональными центрами Беларуси и Соединенных Штатов. Подбор участников будет проводиться на конкурсной основе в пяти городах республики — Бресте, Гомеле, Гродно, Минске и Молодечно. Непосредственную координацию программы в Беларуси проводит Американский совет по сотрудничеству в области образования ACCELS.

За дополнительной информацией можно обратиться в минское отделение ACCELS по адресу: **220005, Минск, пр.Скорины 31—18, ACCELS, программа Community Connections, тел/факс:(017) 236-68-83.**

Анна КУЗЬМИНА.

Погода

24 и 25 сентября сохранится облачная с прояснениями погода.

24 сентября на большей части территории, 25-го местами по республике — дожди. Температура ночью +4...+9, 25 сентября местами заморозки до -3, днем +9...+14 градусов.

Сяргей ЗАКОННІКАЎ

Без духоўнасці ў чалавецтва няма будучыні

Стоячы на парозе XXI стагоддзя, усе мы — зямляне — задумваемся над тым, як жыць далей. Канешне ж, у кожнага народа ёсць свае спецыфічныя праблемы: палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя. Яны з пераменным поспехам вырашаюцца. Аднак ёсць у вялікай чалавечай сям'і і надзвычай складаныя, агульныя праблемы: як захаваць нашу планету і яе насельніцтва здаровымі ў экалагічным плане, як вывесці ўсіх людзей з рабства і таталітарызму да свабоды і дэмакратыі, як аберагчы душу чалавека ад культурнай і маральнай дэградацыі? На жаль, выдатныя навуковыя адкрыцці, новыя тэхналогіі, значнае павышэнне матэрыяльнага дабрабыту людзей у многіх краінах свету не суправаджаюцца і сёння неабходным духоўным сталеннем чалавецтва. Наадварот, занядбанне маральнага ўдасканалення чалавека, мізэрнасць сродкаў, якія выдзяляюцца ўрадамі краін на ахову здароўя, адукацыю, культуру, прыводзяць да таго, што паўсюдна расце злачыннасць, наркаманія, мільёны людзей заўчасна паміраюць ад новых страшных хвароб. Духоўнасць выхоўваецца не толькі рэлігійным вераваннем. Спакон веку яе падтрымліваюць у чалавеку мастацкая літаратура, тэатр, музыка, жывапіс. Іх значэнне ў нашым жыцці нельга пераацаніць.

Не так даўно ў горадзе Вашынгтоне праходзіла канферэнцыя "Пошук новай сусветнай культуры XXI стагоддзя: накірункі заходняй літаратуры", якую арганізавалі Фонд газеты "Вашынгтон Таймс" і Міжнародны фонд Ккльтуры. 348 паэтаў, празаікаў, драматургаў, літаратуразнаўцаў, філосафаў, гісторыкаў, рэлігійных дзеячаў са 110 краін свету сабраліся разам, каб сваім роздумам зазірнуць у новае стагоддзе, вызначыць задачы літаратуры, культуры на новым этапе жыцця чалавецтва. Нават самі тэмы, якія абмяркоўваліся на канферэнцыі: "Традыцыі і сучаснасць у заходняй літаратуры", "Пісьменнік перад абліччам сучаснага свету", "Узаемадзеянне культур", а таксама дыскусія "Паўнацэннае развіццё асобы і сямейнае выхаванне" перадаюць сэнс і дух гэтага мерапрыемства, удзельнікам якога давялося быць і мне. Хачу, няхай сабе і фрагментарна, пазнаёміць чытачоў газеты з тым, што адбывалася ў сценах вашынгтонскага "Грант гаят атэля".

У сваім дакладзе Пол Джонсан, гісторык з Англіі, падкрэсліў, што геапалітычны кантэкст, у якім знаходзіцца культура, застаецца складаным. Чалавецтва перажыло шэраг крывавых войнаў, фашысцкія канцэнтрацыйныя лагеры, сталінскі ГУЛАГ і многае іншае, але, на вялікі жаль, яшчэ хварэе на гвалтоўны прымус, рабства. У многіх людзей і нават народаў назіраецца імкненне да самаразбурэння. Монстр таталітарызму дагэтуль стаіць на нагах, хоць ён зараз і не такі ўжо моцны.

Калі прагназаваць значэнне рэгіёнаў зямнога шару, то і ў наступным стагоддзі Амерыка застанецца эфектыўнай краінай, чый палітычны і эканамічны ўплыў на развіццё свету будзе даволі адчувальным. Увагу да сябе звернуць Кітай і былы Савецкі Саюз. Камунізм у любой форме сёння страціў сваю ранейшую прыцягальнасць. Аднак патрэбна не скідаць з рахунку і тое, што яго рэцыдывы маюць і яшчэ будуць мець месца ў былых савецкіх рэспубліках. Што тычыцца кітайцаў, то яны ўжо дзякуюць Богу за першыя парасткі росквіту дабрабыту з прычыны ўводу рынкавых адносін. Ганконг, які паглынуты камуністычным Кітаем, — гэта траянскі конь. Апошняя імперыя ў свеце павінна будзе ўводзіць свабоды, дэмакратычны парадак, якія пануюць у далучаным рэгіёне. Набывае моц Індыя, дзе рушацца старыя структуры і адчуваецца нястрымны поступ да дэмакратыі і прагрэсу ва ўсіх сферах жыцця. Важнае становішча паміж Азіяй і Еўропай зойме Турцыя, чыя прысутнасць у свеце стане прыкметнай.

Лічу, што новае стагоддзе павінна быць пераломным у жыцці чалавецтва і прынесці маральны і культурны прагрэс. Думаецца, што ў ім створыцца агульная база для далейшага развіцця і ўмацавання хрысціянскіх традыцый у штодзённым жыцці і ў літаратуры, культуры. Біблія і ўсе хрысціянскія пастулаты застануцца. Застанецца і выкупленне чалавекам сваіх грахоў. Выдатны пісьменнік Бернард Шоў, які прадказваў знікненне рэлігіі, не меў рацыі. Рэлігія была, ёсць і будзе стрыжнем у жыцці сусветнага грамадства. Яе адраджэнне можна заўважыць па тым, як значна расце ў свеце колькасць вернікаў, як больш эфектыўна выкладаецца закон божы ў звычайных навучальных установах, як масава адкрываюцца рэлігійныя школы, універсітэты, дзе выхаванне адметнае сваёй высокай якасцю, духоўнай напоўненасцю. Даўно вядома, што рэлігійнае выхаванне ўздзейнічае на чалавека непараўнальна лепей, чым сілавыя метады: дубінкі, суды, турмы і г.д.



Думаю, што адбудзецца адраджэнне літаратуры і мастацтва, і асабліва паэзіі. Ніякія машыны, ніякія камп'ютэры не заменяць паэтаў ці філосафаў. Любоў да паэзіі, імкненне праз яе ўдасканальваць сваю духоўнасць, сваю асобу мы павінны перадаць нашым дзецям, новым пакаленням...

Пра сувязь праблем развіцця дэмакратыі і літаратуры гаварыў у сваім выступленні амерыканскі пісьменнік і журналіст Давід Нэвін. Ён зазначыў, што ў антычнасці ў дэмакратыі была надта кепская рэпутацыя. Часта яна перараджалася ў тыранію. Гэта небяспека застаецца і сёння. Новы этап развіцця дэмакратыі цягнецца ўжо дзвесце гадоў, але і цяпер мы стаім яшчэ далёка ад дасканаласці.

Дэмакратыя — гэта надта далікатная, крохкая расліна, якая патрабуе пастаяннай увагі, аховы і абароны. У першую чаргу трэба абараняць правы чалавека, свабоду слова, друку. Голад чалавецтва па свабодзе, па праўдзе надзвычай глыбока адчуваецца ў творах Оруэла, Кэстлера. Праўда гісторыі з'яўляецца важнейшым рыштункам кожнага пісьменніка. Адначасова яна дапамагае ўсталяванню дэмакратыі, калі так можна сказаць, падкормлівае, вырошчвае яе.

Мне думаецца, што адносіны ў свеце павінны развівацца як агульнае цэлае. Няма сумнення ў тым, што дэмакратыя стане лейтматывам новага стагоддзя.

Клод Дзюран-Бергэр, пісьменнік, выдавец, дырэктар лацінаамерыканска-еўрапейскай праграмы абмену (Францыя), сказаў, што ва ўсім свеце адбываецца асэнсаванне і ўмацаванне свабоды як галоўнага атрыбуту жыцця чалавецтва. Яна ўсталёўваецца з Захаду на Усход. Вельмі важна зараз наладзіць нармальнае, плённае партнёрства свабоды ўсіх рэгіёнаў, якое павінна дасягнуць дасканаласці ў наступным стагоддзі. Нешта новае праглядаецца ўжо ў адносінах паміж ЗША і лацінаамерыканскімі краінамі, якія прайшлі або праходзяць складаны працэс сацыяльнага станаўлення. Перш за ўсё гэта грунтоўныя двухбаковыя дамовы па самых важнейшых аспектах палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця. Цывілізаванымі, чалавечнымі павінны стаць і транскантынентальныя адносіны ў свеце.

З цікавасцю было выслухана выступленне вядомага кінарэжысёра, акцёра, пісьменніка, прэзідэнта Інтэрнацыянальнага фонду развіцця кіно і тэлебачання для дзяцей і моладзі Ралана Быкава (Расія), які ў сваім надзвычай глыбокім і эмацыянальным выступленні закрануў самыя набалелыя пытанні духоўнай сферы чалавечага жыцця. Ён гаварыў пра тое, што, даследуючы дзіцячую душу, заўсёды думае і пра лёс чалавецтва: чым усё скончыцца? Бо канчаецца стагоддзе, а праблем перад намі паўстае ўсё больш і больш. Культура адступае. Мы былі на вышыні арлоў, а цяпер апынуліся на ўзроўні жаб. Літаратура зараз знаходзіцца ў рэзервацыі, яна яшчэ жыве ў сярэдняй школе і часткова ў ВНУ. У астатнім свеце яе няма — спаўзла ў сферу абслугоўвання ў выглядзе самых розных падробак пад літаратуру. А сапраўдная літаратура — гэта падмурак духоўнасці, інтэлектуальнага і эстэтычнага развіцця чалавека. Цяпер месца літаратуры заняло тэлебачанне. Яно прэтэндавала займець статус мастацтва, але з гэтага нічога не атрымалася. Розныя шоу, забаўляльныя праграмы не ўздзейнічаюць на розум і душу, яны пакідаюць людзей у адзіноце. Сёння тэлебачанне не мае глыбокай духоўнай напоўненасці, якая ад яго патрабуецца, яно выконвае ролю звычайнага сродку масавай інфармацыі. І стаіць побач з іншымі сродкамі: ад мух, камароў, прусакоў, ад аблысення, ад імпатэнцыі. Тэлебачанне стала бізнесам і фактычна з'явай антыкультурнай. Тэлевізійны стыль паразумення, жаргоны збядняюць мову, культуру кожнага народа.

Я не песіміст, але мне здаецца, што чалавецтва да канца нашага стагоддзя вычарпала запас духоўнасці, які назапашваўся пачынаючы з сярэдніх вякоў. Разам з занядбаннем літаратуры, культуры людзі губляюць імкненне да ідэалу, а гэта вельмі небяспечна. Чалавек — не толькі біялагічная і сацыяльная сістэма, але, і ў першую чаргу, сістэма духоўная. Калі духоўная актыўнасць чалавека падае, то паміраe мараль. І зараз мы маем некалькі апакаліптычных вузлоў: атамная вайна, экалагічная катастрофа, яўная шызафрэнізацыя насельнікаў Зямлі (парушэнне псіхікі: маньякальнасць, садызм, гвалт, разбой, наркаманія, гомасексуалізм і г.д.). Гэта тычыцца ўсіх без выключэння краін: і бедных, і з высокім узроўнем дабрабыту.

(Заканчэнне на 2-ой стар.)

Курсы обмена наличных валют в коммерческих банках и официальный курс, установленный Национальным банком на 15 сентября 1997 г. (по состоянию на 9.50)

Наименование банка	USD Покупка	USD Продажа	DM Покупка	DM Продажа	RUR Покупка	RUR Продажа	Телефон для справок
Минск (0-172)							
Абсолютбанк	27700	27760	15550	15590	4,71	4,73	636-080
Белагропромбанк	27760		15580		4,72		285-716
Белбизнесбанк (гл. опер. упр.)	27700	27760	15440	15590	4,70	4,73	769-531
Белбизнесбанк (гор. дир.)	27200	27760	15300	15590	4,64	4,73	271-960
Белвнешэкономбанк							267-022
АКБ "Золотой талер"	27760		15590		4,73		267-597
Минский транзитный банк	27700	27760	15500	15590	4,71	4,73	132-916
Ф-л "Милавица" АКБ "Минский транзитный банк"	27700	27760	15560	15590	4,70	4,73	372-825
Ф-л Мосбизнесбанка	27600	27760	15400	15600	4,68	4,73	286-278
Народный банк	27550	27760	15450	15590	4,69	4,73	238-610
"Новоком"	27600	27760	15450	15590	4,70	4,73	603-402
Приорбанк	27500	27760	15400	15590	4,69	4,73	455-721
РРБ	27660	27760	15490	15590	4,69	4,73	266-941
"ФФФ"	27730	27760	15560	15590	4,71	4,73	621-601

Информация предоставлена ПКФ "Агентство Гревцова". Тел./факс (017) 262-16-17.

Сяргей ЗАКОННІКАЎ

Без духоўнасці ў чалавецтва няма будучыні

(Заканчэнне. Пачатак на 1-ай стар.)

У аснове цывілізацыі павінна быць культура. Без яе адраджэння і развіцця нельга будзе жыць у новым стагоддзі.

Змястоўнай атрымалася і дыскусія "Паўнацэннае развіццё асобы і сямейнае выхаванне". У сваім выступленні прэзідэнт фонду "Вашынгтон Таймс" і Міжнароднага фонду культуры Донг Мун Джо сказаў, што ў людзей ёсць выдатная прывілея, якой няма ва ўсім іншым жывым свеце, — любіць. Яна дадзена вышэйшаю воляю. Здольнасць любіць трэба пастаянна ў сабе выхоўваць.

Чалавек не існуе толькі для сябе. Ён у адказе за ўсё. І ў першую чаргу — за сваю сям'ю. Здаровая, гарманічная сям'я — аснова здароўя, росквіту нацыі, а далей і ўсяго чалавецтва. З такою мэтаю трэба ўваходзіць у новае стагоддзе.

Лідэрамі могуць быць толькі тыя людзі, існасць якіх напоўнена актыўным духоўным жыццём. Бацькі ў сем'ях, настаўнікі, выкладчыкі ў навучальных установах, кіраўнікі краін у сваёй дзейнасці і жыцці павінны паказваць прыклад. Той, хто выхоўвае, сам абавязаны быць дасканалаю асобаю, тады і яго вучні вырастуць сапраўднымі людзьмі.

Іншыя ўдзельнікі дыскусіі — Джэк Корлі, Тоні Дэвін, супрацоўнікі Міжнароднага фонду адукацыі, а таксама літаратары з розных краін свету — закраналі самыя розныя аспекты сямейнага выхавання, духоўнага развіцця асобы.

Канферэнцыя прыняла рашэнне стварыць Федэрацыю літаратараў за мір ва ўсім свеце. Мэты гэтай арганізацыі фармулююцца наступным чынам: *"Літаратура з'яўляецца неад'емнай часткай культуры. Пісьменнікі трымаюць у сваіх руках люстэрка, у якім адбіваецца іх эпоха. Яны раскрываюць самыя глыбокія, нават падсвядомыя імкненні сваіх сучаснікаў і, часам, прапануюць дакладныя дыягназы нездаровых працэсаў, якія могуць паўплываць на арганізм грамадства.*

У выніку гэтага пісьменнікі зоймуць цэнтральнае месца ў працэсе фарміравання творчага вобраза свету, які ўзыходзіць на парозе XXI стагоддзя. Мы знаходзімся на важнай пераходнай мяжы гісторыі чалавецтва не толькі з прычыны змены календара, які ўводзіць нас у новае тысячагоддзе, але і ў выніку змен, якія адбываюцца ў акаляючым нас свеце. Былі разбураны геапалітычныя бар'еры часоў "халоднай вайны". Новы свет фарміруецца ў атмасферы сумятні і бязладдзя.

Тэхналогія і гандлёвыя адносіны толькі знешне аб'ядналі ўсіх у адзіны свет, таму што нас усё яшчэ падзяляюць адрозненні ў культурных і этнічных традыцыях. Задача сённяшняга дня заключаецца ў пераадоленні такога разбуральнага падзелу і ў фарміраванні гарманічнай глабальнай культуры, якая выхоўвае вышэйшыя ідэалы чалавецтва. Гэтага нельга дасягнуць шляхам прымянення ваеннай сілы або палітычнай улады. Толькі сіла культуры вялікага мастацтва і літаратуры здольна ажыццявіць гэтую мэту праз трансфармацыю чалавечага сэрца і ўяўлення. Фёдар Дастаеўскі сказаў: "Прыгажосць уратуе свет".

Прызнаючы важнасць цяперашняга гістарычнага моманту і разумеючы адказнасць, якая ўскладзена на нас за будучыню нашай планеты, Федэрацыя літаратараў за мір ва ўсім свеце аб'ядноўвае пісьменнікаў і літаратуразнаўцаў усіх краін і культур для прасоўвання наперад ідэі станоўчай ролі літаратуры ў працэсе пабудовы мірнага і гарманічнага заўтра. Мэта федэрацыі заключаецца ў садзеянні распаўсюджванню выдатных літаратурных твораў усіх цывілізацый і ў аказанні падтрымкі пры напісанні новых твораў літаратуры, якія адпавядаюць вышэйшым памкненням чалавецтва.


Федэрацыя будзе падтрымліваць ролю літаратуры як маста паміж рознымі расамі, рэлігіямі і культурамі, садзейнічаць дасягненню гармоніі і ўзаемаразумення пры дапамозе сілы мастацтва.

Літаратура з'яўляецца акном у чалавечую душу. Федэрацыя будзе імкнуцца выдзеліць тыя літаратурныя творы, якія праз раскрыццё неад'емных і асноўных аспектаў чалавечай прыроды змогуць прапанаваць чалавецтву бачанне, што дапаможа зразумець сэнс фарміравання сапраўднага характару, пабудовы сапраўдных адносін, выхавання пачуццяў сапраўднай любові і стварэння ідэальнага грамадства. Такім чынам, пісьменнікі змогуць асвятліць шлях чалавецтва да новай і шматабяцаючай будучыні".

Хочацца адзначыць выдатнае арганізацыйнае забеспячэнне канферэнцыі. Гаспадары зрабілі ўсё, каб яе ўдзельнікі змаглі паразумецца (было пяць рабочых моў: англійская, французская, нямецкая, іспанская і руская), мелі пад рукой патрэбную інфармацыю, адчувалі сябе камфортна.

Пасяджэнні, сустрэчы на канферэнцыі працягваліся з васьмі гадзін раніцы і да позняга вечара, а таму няшмат часу было адпушчана для таго, каб пазнаёміцца з Вашынгтонам, яго архітэктурай, шматлікімі музеямі. Я паўдзельнічаў у запланаванай кароткай экскурсіі па горадзе, наведаў разам з усімі мемарыялы Вышынгтона, Лінкольна, карэйскай і в'етнамскай войнаў. Гасцінна сустракалі нас у рэдакцыях газеты "Вашынгтон Таймс" і часопіса "Свет і я". Аднак мне ўдалося знайсці акрайчык часу, каб схадзіць у Нацыянальную мастацкую галерэю і агледзець выставы Пікасо і французскай мініяцюры XVIII стагоддзя. Гэта будзе помніцца.

У час канферэнцыі адбылася творчая сустрэча вядомай амерыканскай паэтэсы Рыты Даў з гасцямі. Прапаную чытачам яе кароткую стэнаграму.



Рыта Даў: "Паэзія дае людзям надзею"

Рыта Даў нарадзілася ў г.Акрон (штат Агайё). Вучылася ў Маямскім універсітэце, у Цюбінгемскім універсітэце (ФРГ) і ва універсітэце Йова. Атрымала шмат літаратурных і акадэмічных узнагарод. Сярод іх Пулітцэраўская прэмія за паэзію (1987), Хайнцэўская ўзнагарода за дасягненні ў мастацтве і гуманітарных навуках (1996), прыз Шарля Франкеля (1996). У 1993—1995 гадах працавала кансультантам па паэзіі ў бібліятэцы амерыканскага кангрэса. Зараз — прафесар англійскай мовы універсітэта штата Вірджынія (г.Шарлотвіль).

Пытанне: Што такое паэзія?

Рыта Даў: Паэзія — гэта момант цуду. Ёй можна ўскалыхнуць самазадаволеныя сытыя душы. Паэзія з'яўляецца, нараджаецца пастаянна, каб быць каталізатарам нашага жыцця.

П.: Як Вы пачалі пісаць вершы?

Р.Д.: Не магу ўспомніць. Гэта не стала нейкай выдатнай падзеяй. Проста быў працяг маіх мрояў, роздуму. Магу адказаць і так — не магла выбраць, што пачытаць нанач. Пачала пісаць сама. Да 14—15 гадоў нікому не паказвала напісанае. Я думала, што паэзія жыве толькі ў кнігах, што ў рэальным жыцці з людзьмі нічога такога адбыцца не можа. І толькі ў коледжы зразумела, што свае задаткі, здольнасці трэба рэалізоўваць. Я доўга не магла быць публічным паэтам, лічыла свой занятак інтымнай справай. Але потым адчула, як паэзія патрэбна людзям. І гэтае адчуванне не праходзіць. Мне пішуць зараз многія чытачы з розных куткоў свету. Гэта і моладзь, і сталыя людзі, але душу кожнага з іх паэтычнае слова зачапіла сваім крылом. Значыць, у паэзіі ёсць унікальная здольнасць наводзіць духоўныя масты над акіянамі і кантынентамі.

П.: Хто быў Вашым літаратурным настаўнікам?

Р.Д.: Мне складана вызначыць тых пісьменнікаў, якія паўплывалі на мяне ў раннія гады. Відаць, гэта Шэкспір, але не ўвесь, хутчэй за ўсё яго санеты, а таксама Дзікенс.

П.: Дзе Вам лепей за ўсё пішацца?

Р.Д.: Канешне ж, у сваім доме. Пішу ў спальні, дзе стаяць тры сталы. А яшчэ на сцяне ў мяне там ёсць дошка. Да яе прымацоўваю лісткі з напісаным, потым перачытваю, нешта выкідваю ў сметніцу, нешта асэнсоўваю, папраўляю. Самае шкоднае для творчасці — тэлефон. Таму нядаўна перасялілася ў хлявчук, што побач з домам. Там няма ніякіх зручнасцей: ні вады, ні туалета. Але, на маю радасць, там няма і тэлефона.

П.: Ці пішаце Вы нешта такое, што можа прынесці боль людзям?

Р.Д.: Калі я пачала пісаць, то ў душы паклялася ніколі не хлусіць, быць абсалютна сумленнай. Гэты прынцып стараюся захоўваць. Жыццё паварочваецца да нас то светлым, то чорным сваім бокам, і яго трэба ўспрымаць такім, якое яно ёсць. Але паэзія адрозніваецца ад іншых жанраў літаратуры. Яна стварае настрой, дае штуршок для роздуму, для душэўнага ці сардэчнага імпульсу. Ды і аўтар не можа кантраляваць чытача, каб ён успрымаў паэтычныя радкі згодна з задуманым. Адзін французскі паэт сказаў, што паэзія — гэта накрыты абедзенны стол. Я для вас падрыхтаваў, а вы рабіце, што хочаце: альбо ешце, альбо раскручвайце, разломвайце і паліце з яго касцёр.

П.: Вы хутчэй за ўсё не лірык, а эпік. А калі так, то ці не здаецца Вам, што ў Вашай творчасці няшмат драматызму, трагізму? Вы пазбягаеце іх або жыццё ў Амерыцы такое бясхмарнае?

Р.Д.: Сапраўды ў амерыканскай літаратуры зараз мала драматызму, трагізму. Мы саромеемся такіх момантаў, часта абыходзім іх. А калі трагізм у творы і ёсць, то ён падаецца вельмі далікатна. Гэта ў нас свайго роду хвароба. Мы мала гаворым пра гвалт, катаванні, войны, смерць. У амерыканца ўсё павінна быць "о'кэй!". Так мы прывучаны адчуваць і ўспрымаць жыццё. І ўсё ж усе мае эпічныя рэчы пабудаваны на няхай сабе маленькіх, але трагедыях. Але якая ў чалавечым жыцці трагедыя малая, а якая вялікая? Хто можа гэта ўзважыць, вызначыць? Ды зрэшты нічога не стаіць на месцы, паэзія мяняецца разам з часам.

П.: Якія яшчэ жанры асвоены Вамі ў літаратуры?

Р.Д.: Я вельмі люблю працаваць са словам. Акрамя паэзіі пішу навелы, апавяданні. Гэтаму дапамагаюць нават дні пікнікоў. Дзеці гуляюць бадмінтон, а мы гатуем салаты, хатдогі, смажым шашлыкі з курыцы. Рукі заняты, а розум, душа без дзеяння. І тады па чарзе пачынаем расказваць нейкія гісторыі, асаблівай папулярнасцю карыстаюцца прыгоды з жыцця нашых продкаў — індзейцаў. Потым нешта кладзецца на паперу.

П.: Як адносіцца сям'я да Вашага любімага занятку?

Р.Д.: З разуменнем. Ды і як можа быць інакш, калі мой муж — раманіст, а дачка, якой чатырнаццаць гадоў, таксама піша вершы. Я думаю, што будзе выдатна, калі праз нейкі час яна нешта напіша і пра мяне. За пяцьдзесят міляў ад нашага дома жыве мая сяброўка. Яна таксама паэтэса. Часта збіраемся, чытаем напісанае. (*Смяеецца.*) Я проста купаюся ў паэзіі.

П.: Якое месца, на Вашу думку, будзе займаць паэзія ў XXI стагоддзі?

Р.Д.: Без паэзіі нельга жыць. Яна ўзвышае чалавека, дае людзям надзею, што іхняе жыццё стане лепшым. Калі ў новым стагоддзі для паэзіі не будзе месца, то мы прападзем. Чалавецтва тады памрэ духоўна. А за духоўнай смерцю наступае і фізічная. Так ужо ўладкаваны наш свет.

Памяць



20 верасня, у дні, калі літаратурная грамадскасць Рэспублікі Беларусь адзначала 85-годдзе з дня нараджэння Максіма Танка, на яго магіле, побач з вёскай Пількаўшчына Мядзельскага раёна Мінскай вобласці быў устаноўлены помнік. Па завяшчанню паэта, які памёр у мінулым годзе, на магіле, дзе спачывае і жонка Яўгена Іванавіча Скурко (Максіма Танка) Любоў Андрэеўна, устаноўлены два сціплыя крыжы з датамі нараджэння і смерці.

На адкрыцці помніка прысутнічалі землякі паэта, вядомыя літаратары і грамадскасць рэспублікі. У Мядзелі ў гэты дзень прайшла літаратурная вечарына, прысвечаная 85-годдзю народнага паэта Беларусі Максіма Танка.

На здымку: падчас цырымоніі адкрыцця помніка.

Фота Генадзя СЯМЁНАВА, БелТА.

Зручнасць сумеснага домаўладання па заслугах ацанілі і ў беларускай сталіцы

Аднагалосна прагаласавалі за стварэнне асацыяцыі ўласнікаў уладальнікі кватэр жылога дома па вуліцы Лынькова, 15-а ў Мінску. У яго ўвойдуць каля 50 фізічных і юрыдычных асоб, якія будуць утрымліваць і эксплуатаваць будынак за кошт камерцыйнай дзейнасці. Аб'яднанне мае права наладзіць дагаворныя адносіны з пастаўшчыкамі цяпла, вады і іншых камунальных выгод. А гэта дасць упэўненасць жыльцам у тым, што ацяпляльны сезон у іх дамах пачнецца без праблем.

На сённяшні дзень асацыяцыі ўласнікаў сумесных домаўладанняў ужо зарэгістраваны ў Брэсце, Кобрыне і Баранавічах. Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў Міжнароднай фінансавай карпарацыі, "пуцёўку ў жыццё" жадаюць атрымаць ужо больш як сем такіх аб'яднанняў жыльцоў беларускай сталіцы.

Тэрэза ХАЮЦІНА, БелТА.

Аўтарытэт Украіны ў ААН рэзка ўзрос

Старшынёй чарговай 52-ой сесіі Генеральнай асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якая адбываецца пад знакам рэформ ААН, па рэкамендацыі ўсходнееўрапейскай групы краін — членаў ААН выбраны міністр замежных спраў Украіны Генадзь Удавенка.

У сваёй прамове Генадзь Удавенка адзначыў сімвалічнасць таго факту, што прадстаўнік толькі што адроджанай дэмакратыі, якая перажывае перыяд глыбокіх сацыяльных, эканамічных і палітычных рэформ, стаў старшынёй сесіі Генеральнай асамблеі менавіта ў той час, калі пытанне рэфармавання ААН стаіць на першым месцы.

"Сёння не існуе ні адной сур'ёзнай перашкоды для таго, каб Арганізацыя Аб'яднаных Нацый стала такой, якой яна павінна быць, і такой, якой мы б хацелі яе бачыць, каб яна не ператварылася ў гістарычны манумент, акружаны светам, які змяніўся і трансфармаваўся", — падкрэсліў старшыня 52-ой сесіі Генеральнай асамблеі ААН.

Творчасць чытачоў

Добры дзень, сябры!

Рэгулярна чытаем "Народную волю", абмяркоўваем.

Дзякуй вам за праўду, аб'ектыўнасць, народнасць! Дзякуй, што вы ёсць!

Займаюся прыпеўкамі. Пішу, спяваю. Дыпламантка конкурсаў.

Вырашыла даслаць вам прыпеўкі для друку. Мо спатрэбяцца?

З павагай —

Марыя ЦІМІНСКАЯ.

Асіповецкі раён,
в.Дзераўцы.

Ад рэдакцыі

З удзячнасцю азнаёміліся з прыпеўкамі Марыі Цімінскай. Шэраг куплетаў прапаноўваем увазе чытачоў "Народнай волі".

Ой, лапці мае...

Ой, лапці мае,
Аборкі з вузламі.
Курдыкнулася жыццё
Дагары нагамі. О-ох!

Ой, лапці мае,
Пляту, горка плачу.
Ботаў век не дакуплюся —
Ўсё на ежу трачу. Во-о!

Ой, лапці мае,
Вісяць на гарышчы.
Ўсё працую, а ў кішэнях
Толькі вецер свішча! У-ух!

